# Рымскія манеты – першыя грошы на Беларусі

Віталь СІДАРОВІЧ



УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: wital.sidarowicz@gmail.com

Распрацаваная заснавальнікам беларускай нумізматыкі В.Н. Рабцэвічам перыядызацыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі пачыналася з перыяду рымскага дэнарыя, але разглядаўся гэты перыяд вельмі сцісла [20, с. 105–106]. У значнай ступені гэта было выклікана недахопам інфармацыі. За апошнія дзесяцігоддзі звесткі пра знаходкі антычных манет на беларускіх землях значна ўзбагаціліся, што дазваляе скарэктаваць наша разуменне гэтага перыяду.

Першае, пакуль яшчэ спарадычнае і нязначнае, паступленне манет на нашы землі можна ўпэўнена аднесіць да латэнскай эпохі – апошніх стагоддзяў да н. э. У беларускай частцы Верхняга Падняпроўя лакалізуюцца знаходкі так званых тэтрадрахмаў тыпу Huşi-Vovrieşti (Хушы-Ваврыешці), якія з'яўляюцца імітацыямі македонскіх тэтрадрахмаў Філіпа II (359–336 гг. да н. э.). Характэрнай асаблівасцю гэтых срэбных манет з'яўляецца наяўнасць глыбокіх надсечак на рэверсе (*малюнак 1*). На думку А. Лявінскага, вытворчасцю імітацый тыпу Huşi-Vovrieşti займалася фракійскае племя трыабалаў у другой палове IV ст. да н. э., а распаўсюджанне гэтых манет на поўнач звязана з іншым фракійскім племенем – гетамі, якія пасля разгрому іх у 331 г. да н. э. скіфамі мігрыравалі ў розныя рэгіёны, у тым ліку на Валынскае ўзвышша [10, с. 31, 119–120].

Менавіта тэтрадрахмы тыпу Huşi-Vovrieşti з'яўляюцца адным з маркераў міграцый гетаў. Да пэўнага часу самыя паўночныя знаходкі такіх манет былі зафіксаваны ў вярхоўях Заходняга Буга і Стыра (правага прытока Прыпяці) [10, рис. 8], але знойдзеныя ў Беларусі манеты [36, p. 129–130] значна пашыраюць арэал іх распаўсюджання і дазваляюць выказаць меркаванне, што невялікая частка гецкага насельніцтва праз басейн Прыпяці магла дасягнуць Верхняга Падняпроўя. Варта адзначыць, што геты, якія ратаваліся ад скіфаў, сыходзілі, на думку А. Лявінскага [10, с. 120], у слабазаселеныя рэгіёны. Верагодна, такім рэгіёнам магла быць і тая частка Беларускага Падняпроўя, дзе былі знойдзены імітацыі тыпу Huşi-Vovrieşti. Гэтая тэрыторыя ў апошняй трэці IV ст. да н. э. з'ўлялася або паўночнай перыферыяй мілаградскай культуры [8, с. 75–76], або «кантактнай зонай» паміж днепра-дзвінскай і мілаградскай культурамі [12, с. 33–37, рис. 2].

Але пранікненне гэтых манет у Верхняе Падняпроўе было, хутчэй, спарадычным, і яго ні ў якім разе нельга лічыць пачаткам грашовага абарачэння на тэрыторыі нашай краіны. Тое самае можна казаць і пра вельмі нешматлікія знаходкі грэчаскіх [37, p. 72–73] і кельцкіх манет [6; 7] III–I стст. да




*Тэтрадрахмы тыпу Huşi-Vovrieşti з Магілёўскай вобласці:*
*1 – в. Ізюмава, Бабруйскі раён; 2–3 – в. Гарадзец, Быхаўскі раён*
***Малюнак 1***



*Тэтрахалк Панцікапея (220–210 гг. да н. э.) з г. Пінска Брэсцкай вобласці (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь)*

***Малюнак 2***



1



2

*Дэнарыі Рымскай Рэспублікі (са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь)*

***Малюнак 3***

н. э. (*малюнак 2*), а таксама пра дэнарыі Рымскай Рэспублікі II–I стст. да н. э. Апошнія сустракаюцца ў Беларусі ўжо крыху часцей [33, p. 99–100], але не ў такой колькасці, каб іх пранікненне можна было назваць масавым. Распаўсюджанне рымскіх рэспубліканскіх дэнарыяў (*малюнак 3*) і, хутчэй за ўсё, кельцкіх манет звязана, перадусім, з пашырэннем у пачатку так званай эпохі рымскіх уплываў (на мяжы эр) арэала пшэворскай археалагічнай культуры, якую звязваюць з гістарычна вядомым усходнегерманскім племенем вандалаў. Бясспрэчна, пшэворскія помнікі I–II стст. н. э. вядомы на крайнім паўднёвым захадзе Беларусі, у правабярэжжы Заходняга Буга [4, с. 237], але цалкам верагодна, што экспансія асобных груп пшэворцаў на ўсход і паўночны ўсход закранула больш значныя тэрыторыі Беларусі. Пра гэта ўскосна могуць сведчыць знаходкі манет Рымскай Рэспублікі. Прысутнасць адносна значнай колькасці рэспубліканскіх манет у арэале пшэворскай культуры дазваляе даследчыкам меркаваць пра тое, што пшэворцы былі вельмі добра знаёмыя з прадукцыяй рымскіх манетных двароў, якую яны атрымлівалі, магчыма, з кельцкага асяроддзя [31, p. 107–111; 33, p. 93, 99–100]. Верагодна, з вандаламі можна звязваць і пачатак паступлення на нашы землі манет Рымскай Імперыі, адчаканеных у I–II стст.

На жаль, слабая даследаванасць пшэворскіх помнікаў на тэрыторыі Беларусі і малалікасць знаходак дэнарыяў Рымскай Рэспублікі не дазваляюць выказваць меркаванні аб ролі гэтых манет у жыцці насельніцтва захаду Беларусі ў I ст. – сярэдзіне II ст. Магчыма, мы можам лічыць, што дзякуючы вандалам адбылося першае знаёмства тутэйшага насельніцтва з такім надзвычай важным прадуктам антычнай цывілізацыі, як манета.

Сапраўдны масавы прыток манет Рымскай Імперыі звязаны ўжо з іншымі народамі. Гэта, у першую чаргу, яшчэ адно ўсходнегерманскае племя – готы, якія з'яўляліся носьбітамі вельбарскай археалагічнай культуры. Прыкладна ў апошнія дзесяцігоддзі II ст. яны пачынаюць свой рух з Памор'я ў паўднёва-ўсходнім напрамку і займаюць вялізныя тэрыторыі, у тым ліку Беларускае Пабужжа. Насельніцтва вельбарскай культуры было вельмі добра знаёма з рымскімі манетамі. Яшчэ падчас свайго размяшчэння ў Паморʼі готы кантралявалі знакаміты Бурштынавы шлях, безумоўна, маючы з гэтага прыбытак у выглядзе рымскіх прадметаў, у тым ліку манет. Пачынаючы з III ст., калі на тэрыторыі сённяшніх Украіны, Малдовы і Румыніі ўтвараецца чарняхоўская культура[1], аснову якой складалі менавіта готы, гоцка-рымскія кантакты робяцца вельмі інтэнсіўнымі. Гэтыя кантакты маюць, у першую чаргу, не эканамічны, а вайсковы характар. Нарабаваныя падчас набегаў на рымскія правінцыі багацці, а таксама выплаты кантрыбуцый і выкупаў за палонных мелі вынікам накапленне ў варвараў каласальнай колькасці рымскіх манет. Апрача таго, Рымская Імперыя рэгулярна выплачвала значныя грашовыя сумы прыгранічным плямёнам за «лаяльнасць», г. зн. за падтрыманне міру і ахову рымскага лімеса (мяжы) ад іншых нападнікаў, а шмат варвараў (у першую чаргу, германцаў) служылі ў дапаможных частках рымскай арміі. Не варта адкідваць і эканамічныя спосабы паступлення грашовых эмісій Рымскай Імперыі ў Барбарыкум [28, s. 70–71]. У перыяды мірнага суіснавання ў Імперыю ад паўночных варвараў масава паступалі харчаванне, футра, бурштын і г. д. У адваротным кірунку рухаліся прадметы раскошы, бронзавы і шкляны посуд, упрыгажэнні і, безумоўна, манеты (у першую чаргу, срэбныя дэнарыі).

Большасць беларускіх знаходак рымскіх срэбных манет паходзіць з захаду і паўднёвага захаду краіны. Найвялікшая іх канцэнтрацыя назіраецца ў Пабужжы [22], якое ў эпоху рымскіх уплываў было занята помнікамі вельбарскай культуры. Яшчэ адзін рэгіён, для якога характэрна значная колькасць рымскіх дэнарыяў, таксама варта звязваць з насельніцтвам гэтай культуры. Гэта Пінска-Столінскае Палессе (пераважна, міжрэчча Стыра і Гарыні) з прылеглым да яго басейнам Ясельды [3, с. 391–392; 25].

Наступным рэгіёнам са значнай колькасцю знаходак рымскага манетнага срэбра з'яўляецца частка Панямоння, якая адпавядае сённяшнім заходнім раёнам Гродзенскай вобласці, перадусім Шчучынскаму

[1] *Помнікі гэтай культуры на тэрыторыі Малдовы і Румыніі частка даследчыкаў вылучае ў асобную культуру Сынтана дэ Мурэш.*

і Гродзенскаму. На жаль, археалагічная даследаванасць помнікаў першых стагоддзяў н. э. на захадзе Гродзеншчыны застаецца вельмі слабой і этнакультурная прыналежнасць мясцовага насельніцтва ў эпоху рымскіх уплываў і ў пачатку эпохі вялікага перасялення народаў застаецца, як правіла, пад пытаннем. Але значная колькасць знаходак срэбных рымскіх манет [18; 26], у тым ліку і скарбаў [19; 2], якая ўласціва для арэалаў германскіх археалагічных культур, дазваляе меркаваць, што гэта частка Панямоння магла быць заселена носьбітамі вельбарскай культуры або, прынамсі, з'яўляцца зонай іх актыўнай экспансіі. Ускосна пра гэта могуць сведчыць археалагічныя даследаванні ў прылеглых да Гарадзеншчыны раёнах Польшчы [гл., напрыклад: 27, s. 229–258].

Такім чынам, ёсць значныя падставы меркаваць, што насельніцтва вельбарскай культуры з'яўлялася асноўным (нават дамінуючым) пастаўшчыком рымскіх манет на тэрыторыю Беларусі. Але гэта датычыцца срэбных дэнарыяў (*малюнак 4*) і, верагодна, рымскага манетнага золата. Медныя манеты Рымскай Імперыі (перадусім, буйныя наміналы II ст. – сярэдзіны III ст.) паступалі на нашы землі іншымі шляхамі. Памеры гэтых паступленняў, у параўнанні са срэбрам, былі даволі сціплымі, але іх нельга назваць выпадковымі. Звязаны яны, перадусім, са складанымі этнасацыяльнымі працэсамі, якія адбываліся ў эпоху рымскіх уплываў.



*Дэнарыі Рымскай Імперыі (са скарбу з-пад в. Малеч Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці; Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь)*

***Малюнак 4***

Так, у III–IV стст. адбываюцца міграцыі балцкага насельніцтва з паўночна-ўсходняй Польшчы і заходняй Літвы ва ўсходнім напрамку, у тым ліку на тэрыторыю Беларускага Панямоння. З гэтым насельніцтвам звязана, хутчэй за ўсё, фарміраванне культуры ўсходнелітоўскіх курганоў [13, с. 16–18]. Сведчаннем гэтых міграцый могуць быць адносна шматлікія знаходкі рымскай імперскай манетнай медзі, у першую чаргу ў паўночна-ўсходнім Панямонні, а таксама на нёманска-дзвінскім водападзеле. Варта падкрэсліць, што ў гэтым рэгіёне абсалютна пераважаюць буйныя медныя наміналы сталічнай чаканкі. Такія манеты, на думку А. Запольскай, траплялі ў заходнебалцкія культуры пераважна праз прырэйнскія правінцыі [38, s. 112–113].

На поўначы і ўсходзе Беларусі таксама назіраецца адносна вялікая колькасць медных номіналаў Рымскай Імперыі. Але ў параўнанні з заходнімі абласцямі нашай краіны сярод рымскай медзі тут значную частку складаюць эмісіі ўсходніх правінцый Імперыі (*малюнак 5: 3–4*), перадусім балканскіх і дунайскіх. Гэта датычыцца, у першую чаргу, Падняпроўя, з якога паходзіць каля паловы падобных знаходак у Беларусі [37]. У той жа час тут рэгулярна сустракаецца і медзь сталічнай чаканкі (*малюнак 5: 1–2*), і срэбныя дэнарыі. Своеасаблівасць у складзе знаходак рымскіх




*Медныя манеты Рымскай Імперыі з Віцебскай вобласці:*
*1 – сестэрцый Аляксандра Сэвера (в. Гута, Ушацкі раён);*
*2 – сестэрцый Люцыя Вера (бераг воз. Недрава, Браслаўскі раён);*
*3 – манета Юліі Домны (в. Копцевічы, Чашніцкі раён);*
*4 – манета Макрына (в. Юзафова, Глыбоцкі раён). 1–2 – Рым;*
*3–4 – Нікея (Віфінія)*

***Малюнак 5***

манет на ўсходзе Беларусі тлумачыцца шляхам іх паступлення – з Сярэдняга Падняпроўя. Распаўсюджанне разнастайных рымскіх імпартаў, у тым ліку і манет, стала вынікам утварэння кіеўскай археалагічнай культуры (якая лічыцца адным з верагодных продкаў славян) і далейшых міграцый носьбітаў яе традыцый уверх па Дняпры і яго прытоках, а таксама па прытоках Дзвіны [11, с. 70–72, 90–91]. Гэта культура мела цесныя сувязі з чарняхоўскай культурай, якая, у сваю чаргу, беспасрэдна кантактавала з усходнімі рымскімі правінцыямі. У арэале чарняхоўскай культуры зафіксавана каласальная колькасць знаходак рымскіх манет [16], сярод якіх невялікую, але абавязковую частку складаюць менавіта эмісіі балканскіх, дунайскіх і малаазійскіх правінцый Рымскай Імперыі [1, с. 149, 151]. Адпаведна, знаходкі манет у арэале кіеўскай культуры з'яўляюцца ў пэўнай ступені адлюстраваннем падобных знаходак у чарняхоўцаў.

Колькасць знаходак залатых рымскіх манет у параўнанні з меднымі, а тым больш са срэбнымі, з'яўляецца зусім мізэрнаю. На сёння вядома толькі 16 аўрэусаў і салідаў з 6 месцазнаходжанняў на тэрыторыі Беларусі. Верагодна, што ўсе яны мелі адтуліны або прымацаваныя вушкі, г. зн. з'яўляліся ўпрыгажэннямі (*малюнак 6*). Падобнае выкарыстанне рымскага манетнага золата характэрна не толькі для



Падвескі з рымскіх салідаў другой чвэрці IV ст. з Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці (прыватная калекцыя)

**Малюнак 6**

нашай тэрыторыі, але і для значнай часткі Барбарыкума [гл., напрыклад: 15; 30].

Варварскія плямёны, як правіла, не ўспрымалі залатыя манеты як плацежныя сродкі. Аналагічная сітуацыя назіраецца і з манетнай меддзю, але зусім па іншых прычынах. Калі залатая манета пераўтваралася ў варварскім асяроддзі ва ўпрыгажэнне або «знак адвагі» [29], то медныя манеты (перадусім, буйныя наміналы канца I ст. – сярэдзіны III ст.) выкарыстоўваліся ў якасці сыравіны для бронзаліцейнай вытворчасці. Пацвярджэннем гэтага меркавання служаць знаходкі фрагментаваных (у старажытнасці) манет (*малюнак 7*). Пераканаўча аб такім выкарыстанні рымскай манетнай медзі сведчыць знаходка абломка сестэрцыя ў бронзаплавільнай печы на гарадзішчы Наркунай у Літве [32, p. 11].

Цалкам верагодна, што сыравінная функцыя не была адзінай для медных рымскіх манет. Магчыма, яны маглі выкарыстоўвацца і ў гандлёвых аперацыях



Адсечаны фрагмент сестэрцыя Юліі Мамэі (222–235 гг.) з-пад в. Сянькоўшчына Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці (прыватная калекцыя)

**Малюнак 7**

у якасці таварагрошай. Але надзейных пацвярджэнняў гэтай гіпотэзы пакуль не існуе. Ускосна пра гэта маглі б сведчыць скарбы медных манет, але іх вельмі мала на тэрыторыі Беларусі. Сярод іх вылучаецца комплекс александрыйскіх тэтрадрахмаў апошняй чвэрці III ст. з-пад в. Турэц Карэліцкага раёна, які мог быць прывезены адным з варварскіх ваяроў, што служылі ў дапаможных атрадах рымскай арміі і бралі ўдзел у баявых дзеяннях на ўсходзе Імперыі [35]. Гэтыя манеты, якія выкарыстоўваліся іх гаспадаром на тэрыторыі Імперыі па прамым прызначэнні, у Панямонні страцілі, хутчэй за ўсё, свае пачатковыя функцыі і засталіся, відаць, толькі напамінам пра былое або папоўнілі запас каляровага металу.

Такім чынам, ні медныя, ні залатыя рымскія манеты не маглі адыгрываць ролю першых грошай на тэрыторыі Беларусі. На гэтую ролю маглі прэтэндаваць толькі самыя масавыя на нашых землях антычныя манеты – срэбныя дэнарыі Рымскай Імперыі. Эмісіі гэтых манет былі самымі масавымі ў Старажытным Рыме. Яны павінны былі забяспечыць не толькі грашовае абарачэнне ўнутры краіны, але і інтэнсіўныя знешнеэканамічныя і знешнепалітычныя кантакты. Каласальны аб'ём імпарту самых розных тавараў – ад сыравіны і харчавання да прадметаў раскошы – вымагаў ад дзяржавы вялізных выдаткаў. Нават калі ўлічваць, што да II ст. н. э. пэўная частка імпарту была вынікам актыўнай экспансіі Рымскай Імперыі (трафеі, кантрыбуцыі і да т. п.), усё роўна значная колькасць дэнарыяў ішла на закупку замежных тавараў. Пачынаючы з другой паловы II ст. н. э. вельмі шмат рымскага срэбра выдаткоўвалася рымлянамі на выкуп палонных, выплату кантрыбуцый, аплату «лаяльнасці» варвараў і г. д.

У розных рэгіёнах выкарыстанне рымскіх дэнарыяў было, што зразумела, неаднолькавым. Калі ў старажытных дзяржавах Азіі або на большасці непасрэдна прылеглых да Рымскай Імперыі варварскіх тэрыторый рымскае срэбра, несумненна, ужывалася ў грашовым абарачэнні, то роля гэтых манет на значнай тэрыторыі еўрапейскага Барбарыкума дагэтуль з'яўляецца дыскусійным пытаннем. Сярод рэгіёнаў з нявызначаным статусам рымскіх дэнарыяў застаецца і тэрыторыя нашай краіны.

Перадусім, варта адзначыць, што знаходкі дэнарыяў Рымскай Імперыі фіксуюцца амаль па ўсёй Беларусі, за выключэннем, магчыма, толькі некалькіх раёнаў на паўночным усходзе краіны. Але, як ужо было адзначана вышэй, канцэнтрацыя гэтых знаходак у розных рэгіёнах вельмі значна адрозніваецца – калі на Пабужжы дэнарыі можна лічыць тысячамі (а магчыма, і дзясяткамі тысяч), то ў Падзвінні іх вядома менш за дзясятак. Таму разважаць аб тым, ці можна лічыць срэбныя рымскія манеты першымі грашамі на тэрыторыі Беларусі, мы можам толькі ў дачыненні да паўднёва-заходняй часткі краіны, а менавіта да тэрыторыі, якая ў эпоху рымскіх уплываў з'яўлялася месцам пражывання (і экспансіі?) гота-гепідскіх плямёнаў, г. зн. вельбарскай археалагічнай культуры (*малюнак 8*).

Перад пачаткам гэтых разважанняў абавязкова трэба ўзгадаць пяць функцый, якія, згодна з палітэканамічнай думкай, уласцівыя грошам:

1) мера вартасці;
2) сродак абарачэння;




*Арэалы вельбарскай і чарняхоўскай культур (аўтар В.Г. Беляvец)*
***Малюнак 8***

3) сродак плацяжу;
4) сродак накаплення;
5) сусветныя грошы.

На жаль, функцыю **меры вартасці** практычна немагчыма прасачыць па археалагічных даных. Мы можам толькі меркаваць, што рымскія дэнарыі, якія з’яўляліся невялікімі зліткамі высакаякаснага срэбра, маглі выконваць гэтую функцыю разам з іншымі прадметамі.

Існаванне функцыі **сродку абарачэння** варта лічыць больш аргументаваным. Па-першае, рымскія манеты шырока распаўсюджаны ў арэале вельбарскай культуры [гл., напрыклад: 28; 34], хаця самі па сабе падобныя знаходкі не з’яўляюцца адназначным доказам выкарыстання іх у якасці плацежнага сродку. Па-другое, актыўнае выкарыстанне рымскіх манет уласціва для бліжэйшых сваякоў вельбарцаў – носьбітаў чарняхоўскай археалагічнай культуры, якая ў III–IV стст. была распаўсюджана на тэрыторыі сучасных Украіны і Малдовы. Насельніцтва чарняхоўскай культуры было добра знаёма з рымскімі манетамі, сярод якіх абсалютна пераважаюць срэбныя дэнарыі. На думку К. Мызгіна, на заходніх ускрайках гэтай культуры, набліжаных да лімеса (мяжы Рымскай Імперыі), мела месца актыўнае выкарыстанне манет. Даследчык мяркуе аб існаванні ў гэтым рэгіёне грашовых адносін, але толькі на іх першапачатковай стадыі [14, с. 75–76]. У сваю чаргу, І. Зінькоўская лічыць, што ва ўсім арэале чарняхоўскай культуры ўжо існавала грашовае абарачэнне, няхай і ў пачатковай форме [9, с. 37–38]. Нарэшце, ролю рымскіх манет у жыцці чарняхоўцаў падкрэсліваюць даволі частыя знаходкі варварскіх імітацый, як чаканных, так і літых [5, с. 41], прычым вытворчасць апошніх у арэале чарняхоўскай культуры цяпер мае грунтоўнае пацвярджэнне [17]. Можна меркаваць, што выраб манет, якія капіравалі рымскія срэбныя і залатыя наміналы, быў або выкліканы недахопам арыгінальных манет, або з’яўляўся папросту спробамі мясцовых эмісій (у выпадку са значнай часткай літых манет[2], якія зроблены з некаштоўных сплаваў, гэтыя эмісіі былі фактычна фальшываманетніцтвам). У любым выпадку, можна сцвярджаць, што манеты былі практычна абавязковым і звыклым атрыбутам чарняхоўскага і, цалкам верагодна, вельбарскага насельніцтва.

Для існавання такой функцыі грошай, як **сродак плацяжу**, патрэбна наяўнасць ліхвярства, крэдытнай гаспадаркі і да т. п. Вельбарскае насельніцтва, якое знаходзілася яшчэ вельмі далёка нават ад протадзяржаўнай стадыі развіцця, хутчэй за ўсё, не мела нічога падобнага. Таму гэтую функцыю для рымскіх манет на тэрыторыі Беларусі можна лічыць неіснуючай.

У адрозненне ад папярэдняй існаванне такой функцыі рымскага дэнарыя, як **сродак накаплення**, безумоўна пацвярджаецца знаходкамі скарбаў. На сённяшні дзень на тэрыторыі Беларусі зафіксавана 14 скарбаў рымскіх дэнарыяў, з якіх 6 можна лічыць дакладнымі, 5 маладакладнымі і 3 недакладнымі (інфармацыя пра апошнія застаецца вельмі сціслай і, на жаль, не паддаецца верыфікацыі). Варта адзначыць, што з усіх гэтых дэпазітаў толькі Малецкі скарб, які быў ухаваны ў ляпной пасудзіне вельбарскай культуры, мы можам упэўнена аднесці да класічных накапленняў [24]. Для іншых скарбаў невядомыя ні тара, ні, часцей за ўсё, дакладныя месца і абставіны знаходкі, а такія дэпазіты, як Лышчыцкі скарб [23], а магчыма, і Ставішчанскі [21], і Алекшыцкі [2] скарбы, што былі знойдзены на забалочаных участках, могуць мець ватыўны (ахвярны) характар.

Нарэшце, з пэўнай асцярожнасцю мы можам казаць пра такую функцыю дэнарыяў на нашых землях, як **сусветныя грошы**. І тут, зразумела, варта абапірацца не толькі на даныя беларускай археалогіі і нумізматыкі, але і на значна шырэйшы аб’ём навуковай інфармацыі. Рымскі дэнарый стаў адной з першых сусветных валют (калі не самай першай). Ужо срэбныя манеты рэспублікі шырока выкарыстоўваліся па-за яе межамі, а дэнарыі імперыі вядомыя амаль ва ўсёй Еўропе (за выключэннем хіба толькі яе паўночна-ўсходняга ўскрайку) і на значных частках Азіі і Афрыкі.

* * *

Такім чынам, можна меркаваць, што дэнарыі Рымскай Імперыі выконвалі ў той ці іншай меры чатыры з пяці функцый грошай. Першае спарадычнае пранікненне манет на тэрыторыю сучаснай Беларусі адбываецца яшчэ ў апошнія стагоддзі да н. э. і ў пачатку н. э. разам з рознымі племяннымі групамі, а таксама ў выніку кантактаў мясцовага насельніцтва з культурамі, набліжанымі да антычных цывілізацый. Аднак гэтыя адзінкавыя экземпляры доўгі час застаюцца экзатычнымі і незвычайнымі сведчаннямі пра жыццё далёкіх народаў. Сапраўды шырокае распаўсюджанне манет адбываецца толькі з канца II ст. н. э. дзякуючы прыходу на нашы землі насельніцтва вельбарскай культуры. Готы, якія актыўна выкарыстоўвалі рымскія манеты, паклалі пачатак грашоваму абарачэнню на тэрыторыі Беларусі. Зразумела, што мы можам меркаваць толькі пра самую прымітыўную форму гэтага абарачэння, але, на мой погляд, менавіта срэбныя дэнарыі Рымскай Імперыі варта лічыць першымі грашамі на беларускіх землях.

[2] *Для гэтых манет нярэдка ўжываецца тэрмін «лімесныя» дэнарыі.*

***Бібліяграфічны спіс:***

*1. Бейдин, Г.В. Римские провинциальные монеты на территории Украины в ареале черняховской культуры / Г.В. Бейдин // Древности 2012. Харьковский историко-археологический ежегодник. – Харьков, 2012. – Вып. 11. – С. 147–159.*

*2. Белявец, В. Алекшыцкі манетна-рэчавы скарб эпохі Вялікага перасялення народаў / В. Белявец, В. Сідаровіч // Банкаўскі веснік. – 2018. – № 2. – С. 3–16.*

*3. Белявец, В.Г. Насельніцтва вельбарскай культуры ў гісторыка-культурным развіцці зямель Беларусі рубяжа II/III – пачатку V ст. н. э. / В. Белявец // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя [ред.: О.Н. Левко, В.Г. Белевец]. – Минск, 2016. – Кн. 1. – С. 384–450.*

*4. Белявец, В.Г. Пшэворская культура / В.Г. Белявец // Археалогія Беларусі: у 2 т. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. – С. 235–237.*

*5. Бурше, А. К вопросу о технологии производства ранних варварских подражаний римским монетам (по результатам металлографических анализов) / А. Бурше, К. Мызгин // Нумизматические чтения Государственного исторического музея 2017 года. Материалы докладов и сообщений. – М., 2017. – С. 40–43.*

*6. Горбань, П. О находке монеты кельтской Галлии на территории Беларуси / П. Горбань // Банкаўскі веснік. – 2014. – № 3. – С. 11–12.*

*7. Горбань, П. О новой находке монеты кельтов на территории Беларуси / П. Горбань // Банкаўскі веснік. – 2016. – № 7 (636). – С. 70–71.*

*8. Егарэйчанка, А.А. Мілаградская культура / А.А. Егарэйчанка // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя [рэд.: Т.У. Бялова і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 75–76.*

*9. Зиньковская, И.В. К вопросу о торговле и денежном обращении в Остроготском королевстве Эрманариха / И.В. Зиньковская // Вестн. ВГУ. – Серия: История. Политология. Социология. – Воронеж, 2013. – № 1. – С. 33–40.*

*10. Левинский, А.Н. История гетов в лесостепи Юго-Восточной Европы (конец VI – вторая половина IV вв. до н. э.) / А.Н. Левинский // Stratum plus: Археология и культурная антропология. – Кишинев, 2010. – № 3. – С. 15–127.*

*11. Лопатин, Н.В. Северные рубежи раннеславянского мира в III–V вв. н. э. / Н.В. Лопатин, А.Г. Фурасьев // Раннеславянский мир. – М., 2007. – Вып. 8. – 252 с.: ил.*

*12. Лошенков, М.И. Городища милоградской культуры на территории Беларуси / М.И. Лошенков. – Минск: Минская фабрика цветной печати, 2011. – 406 с.*

*13. Медведев, А.М. Верхнее Понеманье в железном веке и раннем средневековье (I тысячелетие до н. э. – 5 в. н. э.) / А.М. Медведев // Ин-т истории Нац. акад. наук Беларуси. – Минск: Беларуская навука, 2011. – 200 с.*

*14. Мызгин, К.В. Некоторые аспекты политической и экономической истории населения Днепро-Донецкой лесостепи во второй четверти I тыс. н. э. по нумизматическим данным / К.В. Мызгин // Древности Центральной и Восточной Европы эпохи римского влияния и переселения народов: сб. материалов. – Серия «Germania–Sarmatia». – Калининград: Янтарный сказ, 2008. – С. 68–87.*

*15. Мызгин, К.В. О хронологии поступления золотых римских монет на территорию юго-восточного Барбарикума / К.В. Мызгин // Нумизматические чтения ГИМ 2017 года. Материалы докл. и сообщ. – М., 2017. – С. 35–40.*

*16. Мызгин, К.В. Римские монеты в ареале черняховской культуры: проблема источников поступления / К.В. Мызгин // Stratum plus: Археология и культурная антропология. – Кишинев, 2013. – № 4. – С. 217–233.*

*17. Надвірняк, О. Про деякі аспекти локалізації центрів виробництва т. зв. «литих» денаріїв I – III століть н. е. на теренах поширення черняхівської спільноти / О. Надвірняк, О. Погорілець // Актуальні проблеми нумізматики у системі спеціальних галузей історичної науки: тези доповідей V міжнародної науково-практичної конференції. – Меджибіж – Переяслав-Хмельницький – Кропивницький – Київ, 2018. – С. 17–21.*

*18. Побаль, Л. Антычныя грошы ў Гродзенскім Панямонні / Л. Побаль // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 49–52.*

*19. Побаль, Л.Д. Скарб рымскіх манет з Жалудка / Л.Д. Побаль // Шчучыншчына: мінулае і сучаснасць: матэрыялы навук.-практ. краязнаўчай канф., прысвечанай знакамітым людзям, помнікам гісторыі і культуры, гістарычным падзеям і мясцінам Шчучыншчыны. – Ліда, Лідская друкарня, 1997. – С. 42–45.*

*20. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 686 с.*

*21. Сідаровіч, В. Скарб рымскіх манет з-пад вёскі Ставішча Брэсцкага раёна / В. Сідаровіч // Studia Numismatica Albaruthenica. – Мінск, 2011. – Vol. I. – С. 41–48.*

*22. Сидорович, В. Белорусское Побужье в период римских влияний в свете нумизматических находок / В. Сидорович // Деньги и их место в истории общества. Международный нумизматический симпозиум. Тезисы докладов. – Кремница, 2010. – С. 16–17.*

*23. Сидорович, В. Лыщицкий клад римских монет / В. Сидорович // Пятнадцатая Всероссийская нумизматическая конференция: тез. докл. и сообщ. – М., 2009. – С. 44–45.*

*24. Сидорович, В. Малечский клад римских денариев (основные итоги исследования) / В. Сидорович // Pieniądz i sistemy monetarne – wspólne dziedzictwo Europy: Białoruś-Bulgaria-Litwa-Łotwa-Mołdawia-Polska-Rosja-Rumunia-Słowacja-Ukraina: studia i materiały. Pod red.: K. Filipowa, B. Kuklik. – Augustów-Warszawa: ZG PTN, 2012. – S. 29–35.*

*25. Сидорович, В.М. Находки римских монет на территории белорусского и украинского Полесья (бассейн р. Припять) / В.М. Сидорович, К.В. Мызгин // Другія навуковыя чытанні памяці прафесара Валянціна Навумавіча Рабцэвіча: праграмма і тэз. дакл. / Беларус. дзярж. ун-т, гіст. фак.; Нац. гіст.-культурны музей-запавед. «Нясвіж». – Мінск: БДУ, 2014. – С. 16–17.*

*26. Сидорович, В. Новые находки античных монет в Белорусском Понеманье / В. Сидорович // Pieniądz – Symbol – Władza – Wojna. Wspólne dziedzictwo Europy: Białoruś-Estonia-Litwa-Łotwa-Polska-Rosja-Rumunia-Słowacja-Ukraina: studia i materiały. Pod red.: K. Filipowa, B. Kuklik. – Augustów-Warszawa: ZG PTN, 2010. – S. 42–52.*

*27. Andrzejowski, J. Pod wodzą Filimera, czyli osadnicy wielbarscy na Mazowszu i Podlasiu / J. Andrzejowski // Nowe materiały i interpretacje, stan dyskusji na temat kultury wielbarskiej [red.: M. Fudziński, H. Paner]. – Gdańsk, 2007. – S. 229–258.*

28. Bursche, A. *Moneta i kruszec w kulturze wielbarskiej w okresie późnorzymskim / A. Bursche // Przegląd Archeologiczny. – Warszawa, 1983. – T. 31. – S. 47–90.*

29. *Bursche, A. The Battle of Abritus, the Imperial Treasury and Aurei in Barbaricum / A. Bursche // The Numismatic Chronicle. – 2013. – Vol. 173. – P. 151–170.*

30. *Bursche, A. Złote medaliony rzymskie w Barbaricum: symbolika prestiżu i władzy społeczeństw barbarzyńskich u schyłku starożytności / A. Bursche. – Warszawa: Instytut Archeologii UW, 1998. – (Światowit. Supplement Series A: Antiquity, vol. II, 1998). – 306 s. + 26 tabl.*

31. *Dymowski, A. Nummi serrati, bigati et alii. Coins of the Roman Republic in East-Central Europe north of the Sudets and the Cartpathians / A. Dymowski. – Warszawa, 2016. – 341 p.*

32. *Luchtanas, A. Žalvario apdirbimas ankstyvuosiuose rytų Lietuvos piliakalniuose / A. Luchtanas // Lietuvos Archeologija. – 1981. – P. 5–17.*

33. *Myzgin, K. Roman Republican Coins and Their Imitations from the Territory of Ukraine and Belarus / K. Myzgin // Римские республиканские монеты и их имитации с территории Украины и Беларуси. – Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2017. – 290 p.*

34. *Romanowski, A. Znaleziska monet rzymskich z terenów kultury wielbarskiej na Podlasiu, prawobrzeżnym Mazowszu i zachodniej Białorusi / A. Romanowski // Wiadomośći numizmatyczne. – Warszawa, 2007. – R. LI, z. 1 (183). – S. 29–51.*

35. *Sidarovich, V. A hoard of Alexandrian Tetradrachms from the Last Quarter of the 3rd Century AD Found in the Upper Neman Region / V. Sidarovich // Notae Numismaticae–Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 2013. – Vol. VIII. – P. 173–184.*

36. *Sidarovich, V. Barbarian Imitations of Ancient Coins in the Territory of Belarus / V. Sidarovich // Notae Numismaticae–Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 2017. – T. XII. – P. 125–137.*

37. *Sidarovich, V. The Finds of Greek and Roman Provincial coins in Belarus / V. Sidarovich // Notae Numismaticae–Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 2014. – T. IX. – P. 71–94.*

38. *Zapolska, A. The Influx of Roman Coins to the West Balt Culture Enviroment / A. Zapolska // Notae Numismaticae–Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 2013. – T. VIII. – P. 105–123.*

## Roman Coins – the First Money in Belarus

**Vital SIDAROVICH,** *EI "Belarusian State University", Head of Museology Laboratory of Faculty of History, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: wital.sidarowicz@gmail.com.*

**Abstract.** *Over the past decade, the information about the discovery of ancient coins in the Belarusian lands has been greatly enriched. Analysis of the numismatic material and its comparison with the archaeological cultures allowed the author to suggest that it is silver denarius of the Roman Empire that should be considered as the first money in the territory of Belarus.*